М.Скрыпка
М.Шышкін

# "НА СВЯТОЧНАЙ ХВАЛІ"

/уступны маналог - раешнік /

Добры вечар, даражэнькія мужчынкі, жанчынкі, дзяўчаткі, як кветкі, прыгожыя і хлопцы, на іх пахожыя.

Прывітанне перадавікам-героям, хто здабыткі падвоіў, патроіў, хто без крыку "ура" выдае на гара, ведаючы што шэсцьдзесят восьмы - самы высакосны.

У гэтыя дні народ стварае цуды ў Светлагорску і Салігорску, на азотным і суперфасфатным, у лабараторыях першакласных і на палях калгасных.

І ўсё гэта таму, што рабочы клас разам з сялянствам у семнаццатым годзе выйшаў на ленінскую арбіту, пабудаваў вёскі, гарады, заводы, калгасы і першымі свой шлях праклалі ў касмічныя далі, першымі ракету вакол Месяца запусцілі і мякка на Зямлю пасадзілі.

Усюды трэба працаваць без браку, а кінафільмы выпускаць без дзёгцю і лаку, і не абавязкова ў кожнай кінакарціне раздзявацца жанчыне.

Маладым паэтам трэба пісаць проста і ўдала, як Янка Купала.

Начальніку трэба быць чуламу, заўсёды знаходзіцца сярод мас, як у перадвыбарны час.

Неяк сустракаю сябра з Талочына, бачу - яго скасабочыла.

--Што гэта, братка, з табою ?.. Ці не інфаркт ?..

--Не...

--Інсульт ?..

--Не...

--А што ?

--Індпашыў ...

Так, што шаўцы, краўцы, і шыйце так, каб у "Кракадзіл" і "Вожык" не пападаць.

Бацькам, што дзяцей сваіх песцяць, жадаем каб вашы дзеткі цвілі, як ружы-кветкі.

Вам, дзяўчатачкі, жадаем, каб хлопцы ў вас былі дарэчныя, мужныя, сардэчныя, каб вам усе моды падыходзілі, ды не ўсялякія з розуму зводзілі, так што шыйце сабе сукенкі прыстойныя, а не такія, што далей некуды. Каб хлопцы ад смеху не фыркалі, што ў некаторай дзяўчынкі ножкі, як цыркулі.

Хлопцам жадаем; каб дзяўчаты ў вас былі прыгожыя, каб вы нявест выбіралі старанна, ды не ў рэстаране, і не з тых, хто пара за параю на танцпляцоўцы шаркае. Будзьце, хлопцы, да дзяўчат ветлівыя, уважлівыя, каб дзяўчаты пра некаторых хлопцаў не казалі: -- эх, вы --Леанарды Недавінчаныя!

Паварам, кухарам я параду дам: варыце, пячыце смачней дзеля нашых гасцей: бабку, верашчаку, дранікі, бульбачку жараную, параную з парасяцінкай, свежанінай, селядцом, кіслай капустачкай, каб пілося, елася і яшчэ хацелася.

Усім вам жадаем маладосці, весялосці!

Хай жа ўсім вам добрыя людзі заўсёды спадарожнікам будзе ўдача і шчасце!

А зараз заслону насцеж.

Слова маім сябрам-артыстам!

Кастрычнік 68 г.

Арыгінал знаходзіцца ва ўстанове
«Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва»